**БДУ АДЗНАЧЫЎ ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ**
Універсітэт правёў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Галоўнаму закону краіны
Стар. 2

**ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ – МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ**
Эканамічнаму факультэту — 25 гадоў
Стар. 3

**ЖАНОЧАМУ РУХУ Ў БДУ СЁЛЕТА 25 ГАДОЎ**
ПА БСЖ БДУ адзначае 25 гадоў
Стар. 4

**СВЯТА Ў КОЛЕ «СЯБРОЎ» І КАЛЕГ**
У БДУ прайшоў канцэрт, прысвечаны Дню жанчын
Стар. 5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

29 сакавіка 2024 года, № 3 (2281)

## Інавацыйная адукацыя, высокатэхналагічнае супрацоўніцтва: новыя дамоўленасці БДУ і Кітая



Гэта стане магчымым дзякуючы рэалізацыі беларуска-кітайскага праекта «Інстытут інавацыйнай адукацыі пад эгідай БДУ». З боку Кітая выканаўцам выступае Хайнанскі цэнтр перадавога вопыту ў сферы міжнароднай адукацыі (г. Санья). Адпаведная дамова па арганізацыі дадзенай ініцыятывы была падпісана 18 сакавіка падчас афіцыйнага візіту ў Кітай дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём.

Рэктар БДУ адзначыў, што Інстытут інавацыйнай адукацыі не абмяжуецца кітайскім вектарам. Прадугледжваецца, што ён стане цэнтрам прыцягнення іншых універсітэтаў, у тым ліку замежных. На яго базе плануецца навучанне грамадзян найбліжэйшых да Кітая краін і дзяржаўудзельніц праекта «Адзін пояс, адзін шлях». – Гэта своеасаблівая экасістэма, якая прадугледжвае не толькі навучанне студэнтаў і падрыхтоўку спецыялістаў, але і развіццё бізнес-ініцыятыў у рамках сумесных беларуска-кітайскіх эканамічных і індустрыяльных адносін праз стварэнне высокатэхналагічных прадуктаў. Адзначаецца вялікая цікавасць да праекта з боку кітайскіх ВНУ і шырокія магчымасці фарміравання міжнародных сувязяў з прыцягненнем замежных партнёраў. Патэнцыял супрацоўніцтва вельмі высокі, – растлумачыў рэктар БДУ.

На дадзены момант свае намеры па сумеснай рэалізацыі праекта пазначылі ўжо 14 вядучых універсітэтаў Кітая, што кажа пра яго ўнікальнасць і значнасць для развіцця адукацыйнага супрацоўніцтва дзвюх краін. Сама ініцыятыва атрымала вялікую падтрымку на ўзроўні ўрада г. Санья. Для рэалізацыі праекта БДУ перададзена сучасная інфраструктура з магчымасцю рэалізацыі функцый лічбавага ўніверсітэта, ідэнтыфікацыі асобы студэнта і выкладчыка, маніторынгу раскладу, наведванняў, месца і тэмы заняткаў. У рамках праекта будзе арганізавана дэманстрацыйная пляцоўка навукова-тэхнічных дасягненняў комплексу БДУ.

Дадзены праект прадугледжвае таксама калектыўную працу па актывізацыі ўзаемадзеяння ў сферы адукацыі, развіцця экспарту адукацыйных паслуг і павелічэння кантынгенту кітайскіх грамадзян у беларускай ВНУ. Дзейнасць бакоў будзе развівацца ў некалькіх напрамках. Гэта распрацоўка навучальна-метадычнай дакументацыі, падрыхтоўка кітайскіх грамадзян да паступлення ў БДУ, правядзенне сумоўяў, прафарыентацыйных мерапрыемстваў, арганізацыя сумеснага навучання рускай мове як замежнай і англійскай з выкарыстаннем ІКТ. Дарэчы, на базе Хайнанскага цэнтра ў гэтыя дні для прадстаўнікоў школ г. Санья адбылася прэзентацыя адукацыйных паслуг беларускай ВНУ. Таксама былі праведзены перамовы з кіраўніцтвам Упраўлення адукацыі. Дасягнуты дамоўленасці наконт падтрымкі адукацыйных і навуковых праектаў БДУ, пашырэння прысутнасці беларускай ВНУ на тэрыторыі правінцыі Хайнань.



Таксама ў першы дзень візіту ў Кітай быў падпісаны мемарандум аб міжнародным супрацоўніцтве паміж БДУ і ТАА «Санья Ячжоу Бэй Навукова-тэхнічны горад развіцця і будаўніцтва». Гэта дамоўленасць стала адной з першых у рэалізацыі праекта «Інстытут інавацыйнай адукацыі пад эгідай БДУ» і прадугледжвае навуковае і навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне бакоў па сучасных напрамках, уключаючы космас. Навукова-тэхнічны горад Ячжоу Бэй – гэта інавацыйная платформа для правядзення навуковых даследаванняў. Найлепшыя ўніверсітэты Кітая маюць свае структуры ў гэтым горадзе, і БДУ стаў першай беларускай ВНУ, што ўсталявала афіцыйнае супрацоўніцтва.

Таксама БДУ пашырыць супрацоўніцтва з Кітаем у галіне моўнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Адпаведны пакет дакументаў падпісалі рэктары БДУ Андрэй Кароль і Другога Пекінскага інстытута замежных моў Цзі Цзінь Бяа. Дадзеная кітайская ВНУ стала новым партнёрам для БДУ. Афіцыйныя адносіны паміж універсітэтамі замацаваны дзвюма дамовамі. Першая рэгламентуе ўзаемадзеянне ў галіне адукацыі па многіх вектарах. Гэта адкрыццё сумесных адукацыйных праграм, выкананне сумесных навукова-даследчых і адукацыйных праектаў, абмен інфармацыяй, навучальнымі матэрыяламі, арганізацыя канферэнцый, семінараў, практыкумаў, курсаў і падрыхтоўка сумесных публікацый. Другая дамова прадугледжвае акадэмічны абмен студэнтамі першай ступені атрымання вышэйшай адукацыі, а таксама магістрантамі і аспірантамі.

Другі Пекінскі ўніверсітэт замежных моў мае 60-гадовую гісторыю. Навучанне вядзецца на 14 факультэтах па 48 спецыяльнасцях бакалаўрыята. Таксама дзейнічаюць магістратура, аспірантура і 15 навуковых інстытутаў. Прадугледжваецца, што дасягнутыя дамоўленасці будуць спрыяць развіццю партнёрскіх адносін у галіне адукацыі і навукі, паглыбленню і пашырэнню наяўнага супрацоўніцтва.

Акрамя таго, падчас візіту адбылося наведванне Кітайскага ўніверсітэта палітычных навук і права. Бакі актуалізавалі дзейныя паміж ВНУ мемарандум аб паразуменні і дамову аб абмене навучэнцамі. Былі разгледжаны пытанні развіцця ўзаемадзеяння, працэсаў абмену студэнтамі па юрыдычных спецыяльнасцях, удзелу ў навуковых мерапрыемствах і падрыхтоўкі публікацый па юрыспрудэнцыі.

Нагадаем, сёння Кітай з'яўляецца для БДУ адным са стратэгічных партнёраў, актыўна развіваюцца навуковыя, экспертныя і культурныя кантакты. Усяго ў БДУ дзейнічае 99 дамоў з 63 кітайскімі ўстановамі. Гэта больш за 16,5% ад агульнай колькасці ўсіх міжнародных дамоў. Пры гэтым супрацоўніцтва з Кітаем мае станоўчую дынаміку. У канцы кастрычніка мінулага года на базе ФМА адкрылі Даследчы цэнтр ШАС, тут жа ўпершыню




ў Беларусі былі створаны кафедры ўсходазнаўства і комплекснага вывучэння развіцця КНР.

Важным для ўмацавання беларуска-кітайскіх адносін стаў удзел БДУ ў якасці аднаго з заснавальнікаў новай Універсітэцкай сеткі навукова-даследчага супрацоўніцтва (iUNRC, Кітай). Яе адкрыццё адбылося напачатку лістапада 2023 года ў рамках І Міжнароднага кангрэса па навукова-тэхнічных абменах «Адзін пояс, адзін шлях».

Акрамя таго, БДУ вельмі папулярны сярод кітайскіх грамадзян. На сёння замежных студэнтаў больш чым пяць тысяч, і самую вялікую долю складаюць навучэнцы з Кітая – тры з паловай тысячы.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

Універсітэт
29 сакавіка 2024 года, № 3 (2281)

# БДУ адзначыў Дзень Канстытуцыі

**Напярэдадні Дня Канстытуцыі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт правёў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Галоўнаму закону краіны. Сярод іх – дыялогавыя пляцоўкі, круглыя сталы, канферэнцыі, лекцыі, конкурсы і выставы.**





Удзельнікамі мерапрыемстваў сталі студэнты і супрацоўнікі розных факультэтаў, інстытутаў і падраздзяленняў БДУ. Цэнтральную частку падзей склала серыя дыялогавых пляцовак з удзелам дзяржаўных дзеячаў, прадстаўнікоў органаў улады, дэпутатаў. У якасці запрошаных гасцей выступілі Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Пётр Міклашэвіч, генеральны дырэктар агенцтва «Мінск-Навіны», старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй Крывашэеў і дырэктар Нацыянальнага архіва Беларусі Андрэй Дзямянюк. Таксама да ўдзельнікаў мерапрыемстваў звярталіся прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Ганна Бакун, дэкан факультэта журналістыкі Аляксей Бяляеў, загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрфака Рыгор Васілевіч і інш.

Далучылася да свята і студэнцкае самакіраванне: 1 сакавіка стартаваў моладзевы праект «Канстытуцыя: 30 гадоў асноўнаму закону». На працягу двух тыдняў хлопцы і дзяўчаты станавіліся ўдзельнікамі віктарын, конкурсаў і квізаў. Таксама студэнты маглі праявіць сябе ў Instagram-чэлленджы «#Канстытуцыя30», дэбат-турніры «Нормы Канстытуцыі: за і супраць».

Акрамя таго, у бібліятэчных залах Юрыдычнага каледжа, Інстытута бізнесу і Інстытута тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла БДУ працуюць кніжныя экспазіцыі на тэму канстытуцыйнага права. А на філалагічным факультэце арганізаваны конкурс на найлепшы пераклад асобных раздзелаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на славянскія мовы, што вывучаюцца на факультэце.

– На пляцоўках ВНУ выступаюць палітыкі, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы. Такія сустрэчы з'яўляюцца добрай магчымасцю для маладых людзей пакамунікаваць з асобамі, якія стаяць ля вытокаў станаўлення беларускай дзяржаўнасці, – адзначыў рэктар Андрэй Кароль.

Арганізатарамі мерапрыемства сталі ўпраўленне па выхаваўчай рабоце з моладдзю, рэспубліканскае аб'яднанне «Белая Русь», БРСМ, пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі работнікаў і студэнтаў, Фундаментальная бібліятэка і Студэнцкі гарадок БДУ.




## *Даведка*

*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Асноўным Законам дзяржавы, які мае вышэйшую юрыдычную сілу і прамое дзеянне на ўсёй тэрыторыі краіны. У Канстытуцыі закладзены асновы рэгулявання прававой, палітычнай і эканамічнай сістэмы дзяржавы. Асноўны Закон замацоўвае неад'емныя Правы чалавека і гарантыі іх рэалізацыі, узаемныя абавязкі грамадзяніна і дзяржавы, парадак фарміравання і функцыянавання органаў улады. Палажэнні Канстытуцыі знаходзяць сваё развіццё ў бягучым заканадаўстве.*

*Канстытуцыя **Рэспублікі Беларусь** прынята ў 1994 годзе, замацоўваючы статус рэспублікі як унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы. Сёння дакумент утрымлівае 9 раздзелаў і 156 артыкулаў, з дапаўненнямі, прынятымі на рэферэндумах 1996, 2004 і 2022 года. У якасці дзяржаўнага свята Дзень Канстытуцыі (15 сакавіка) устаноўлены загадам Прэзідэнта ў 1998 годзе.*

## ПРЫЗНАЧЭННІ

**Прарэктарам па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ прызначаны кандыдат тэхнічных навук дацэнт Віктар Кочын.**

**Даведка:**

Кочын Віктар Паўлавіч нарадзіўся ў 1983 годзе ў г. Барысаў. У 2005 годзе скончыў факультэт радыёфізікі і электронікі (факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій) БДУ, у 2006 годзе – магістратуру. У 2015 годзе паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 2016 годзе яму прысвоена вучонае званне дацэнта. Прафесійную дзейнасць у БДУ пачаў у 2004 годзе. Працаваў на пасадах малодшага навуковага супрацоўніка, асістэнта кафедры кібернетыкі, начальніка аддзела суперкамп'ютарных тэхналогій, намесніка начальніка цэнтра – начальніка аддзела сеткавых і суперкамп'ютарных тэхналогій Цэнтра інфармацыйных тэхналогій (ЦІТ). З 2017 года па сакавік бягучага года ўзначальваў ЦІТ. Таксама ў цяперашні час па сумяшчальніцтве працуе дацэнтам кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій ФРКТ. Віктар Кочын з'яўляецца адным з вядучых спецыялістаў Беларусі ў галіне інфармацыйных тэхналогій і неаднаразова далучаўся ў якасці эксперта для ацэнкі праектаў Парка высокіх тэхналогій і Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі. Прымаў актыўны ўдзел у рэалізацыі работ у рамках буйных дзяржаўных праграм. Цяпер – старшыня Дзяржаўнага экспертнага савета №6 «Інфарматыка, інфарматызацыя і касмічныя даследаванні», членам экспертнага савета Парка высокіх тэхналогій. Удастоены падзякі рэктара БДУ (2006), граматы БДУ (2012), граматы Міністэрства адукацыі Беларусі (2016), падзякі старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2021), падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2021). «Найлепшы эксперт года – 2023».



# Эканамічны факультэт – мінулае і сучаснасць




**Эканамічнаму факультэту – 25 гадоў. Але яго гісторыя нашмат старэйшая і сыходзіць сваімі каранямі да самага пачатку існавання БДУ.**

## Мінулае

Навучанне спецыялістаў гэтага профілю ў Беларускім дзяржаўным універсітэце пачалося з моманту яго адкрыцця ў 1921 годзе. Гэта быў час станаўлення нацыянальнай акадэмічнай эканамічнай школы Беларусі. За падрыхтоўку студэнтаў адказвала аддзяленне факультэта грамадскіх навук (ФГН) універсітэта.

Навучальны план зацвердзіла предметная камісія па эканоміцы, старшынёй якой выступіў рэктар БДУ **Уладзімір Пічэта**.

У 1925 г. ФГН БДУ скончылі 34 эканамісты.

Першая дыпломная работа на тэму «Сельская гаспадарка і фабрычна-заводская прамысловасць СССР у іх рыначных узаемаадносінах» была напісана пад кіраўніцтвам рэктара і абаронена студэнтам-эканамістам **Уладзімірам Каракулькам**. Яму і быў уручаны дыплом БДУ № 1. Ужо ў чэрвені наступнага года пасведчанні аб заканчэнні ўніверсітэта атрымалі яшчэ 85 спецыялістаў. Увосень 1925 г. ад факультэта грамадскіх навук быў аддзелены факультэт права і гаспадаркі (праўгас) з чатырма эканамічнымі аддзяленнямі.

А ў 1927 годзе ў БДУ адкрылі аспірантуру па эканоміцы. Пазней, у 1929 годзе, усе 4 аддзяленні праўгаса БДУ былі вылучаны ў асобны факультэт народнай гаспадаркі. Ён рыхтаваў кадры для новай эканамічнай палітыкі і індустрыялізацыі краіны.

У першыя гады ў БДУ актыўна вяліся тэарэтычныя даследаванні і навуковыя дыскусіі, найперш па пытаннях будаўніцтва сацыялістычнай эканомікі.

Тэмы навуковых пошукаў у значнай ступені насілі міждысцыплінарны характар і перасякаліся з гісторыяй і правам: тэорыя дзяржавы, тэорыя класаў і дыктатуры пралетарыяту, адносіны з сялянствам, тэорыя прадукцыйных сіл і адносін, паняцце ўласнасці.

Два гады з 1925 па 1926 у БДУ працаваў вядомы беларускі гісторык і эканаміст **Мітрафан Доўнар-Запольскі.** У 1926 г. ён выдаў кнігу, якая ўяўляе цікавасць для эканамістаў і сёння – «Народная гаспадарка Беларусі ў 1861–1919 гг.», падрыхтаваў забароненую тады і выдадзеную толькі ў 1994 г. кнігу «Гісторыя Беларусі».

Першыя выкладчыкі-эканамісты БДУ былі і практыкамі: **І. Я. Герцык** з'яўляўся членам прэзідыума Дзяржплана БССР, **А. І. Шэйнін** узначальваў у Дзяржплане Кан'юнктурнае бюро, а Доўнар-Запольскі быў членам эканамічнай секцыі Дзяржплана БССР.

У 1931 г. на аснове факультэта народнай гаспадаркі былі створаны тры інстытуты – планава-эканамічны, фінансава-эканамічны і інстытут спажывецкай кааперацыі, яны ў 1933 г. былі аддзелены ад БДУ і аб'яднаны ў Інстытут народнай гаспадаркі (цяпер БДЭУ), куды перайшлі працаваць многія выкладчыкі-эканамісты нашага ўніверсітэта. Першымі дырэктарамі новай ВНУ таксама былі выпускнікі факультэта народнай гаспадаркі.

## Узнікненне факультэта

1 сакавіка 1999 г. на базе аддзялення эканамічнай тэорыі філасофска-эканамічнага факультэта быў створаны новы факультэт. Па выніках абвешчанага ў БДУ конкурсу канцэпцый дэканам сучаснага эканамфака стаў **Міхаіл Кавалёў**. І ў верасні гэтага года пачалася падрыхтоўка студэнтаў па чатырох спецыяльнасцях: «Фінансы і крэдыт», «Эканоміка», «Эканамічная тэорыя», «Менеджмент».

У 2001 годзе эканамічны факультэт першым у БДУ перайшоў на двухступеньчатую сістэму (бакалаўрыят і магістратура) і пачаў масавую падрыхтоўку магістраў. У той перыяд дзейнічалі кафедры эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, банкаўскай і фінансавай эканомікі, менеджменту, эканамічных навук і кафедра эканамічнай тэорыі.

Ужо ў 2012 годзе пачалася падрыхтоўка па спецыяльнасці «Эканамічная інфарматыка». А наступны год азнаменаваўся структурнымі зменамі на 3 кафедрах, у выніку чаго ўтварыліся 6 новых.

30 жніўня 2018 года дэканам была прызначана кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Ганна Каралёва.

## Сучаснасць

Факультэт развіваецца з вялізнай хуткасцю. Сёння на ім навучаюцца 1050 студэнтаў, 275 магістрантаў і больш за 70 аспірантаў.

Функцыянуе 8 кафедраў:
- Аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі
- Банкаўскай эканомікі
- Карпаратыўных фінансаў
- Інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці
- Міжнароднага менеджменту
- Міжнароднай палітычнай эканоміі
- Лічбавай эканомікі
- Эканамічнай бяспекі

На іх працуюць 150 выкладчыкаў, з якіх 56 кандыдатаў навук, 16 дактароў навук і 17 прафесараў. Па сумяшчальніцтве на факультэце выкладае шэраг вядомых вучоных-практыкаў, кіраўнікоў і вядучых спецыялістаў міністэрстваў, банкаў, кансалтынгавых і IT-кампаній, дзяржаўных і прыватных устаноў.

3 лабараторыі:
- Навукова-даследчая лабараторыя
- Навучальная лабараторыя кафедры лічбавай эканомікі
- Лабараторыя тэхнічных сродкаў навучання

У 2021 годзе адбыўся першы набор на спецыяльнасць «Эканамічная бяспека».

Восенню 2022 года адкрыўся новы корпус факультэта на вуліцы Даўгабродскай. А за 2023 г. была распрацавана і ўкаранёна Праграма павышэння кваліфікацыі настаўнікаў факультатыва па асновах фінансавай пісьменнасці, з'явілася дыстанцыйная магістарская праграма і набор на спецыяльнасць «Дзяржаўны аўдыт».

За апошнія 5 гадоў студэнты эканамічнага факультэта станавіліся пераможцамі і прызёрамі міжнародных алімпіяд па фінансавай бяспецы і гісторыі эканамічных вучэнняў, 6 разоў былі лаўрэатамі конкурсу «Студэнт года БДУ» ў намінацыі «Навука».

Было праведзена шмат міжнародных навукова-практычных канферэнцый, абаронена 33 дысертацыі і ўкаранёна ў вытворчую дзейнасць і адукацыйны працэс больш за 650 навуковых распрацовак.

Таксама да юбілею факультэта ўпершыню ў адукацыйным асяроддзі Беларусі было праведзена мерапрыемства ў фармаце фарсайт-сесіі. Гэта ўнікальная методыка прагназавання будучыні, якая дазваляе вызначыць вектар развіцця на найбліжэйшыя 3-5-10 гадоў з улікам галіновых трэндаў, магчымасцяў і пагроз.

Сваімі асноўнымі мэтамі на наступны год эканамічны факультэт вызначыў павышэнне якасці адукацыі, павелічэнне долі высакакласных спецыялістаў і павышэнне іх прафесійных кампетэнтнасцяў, развіццё выхаваўчай работы ў кантэксце трансфармацыі сацыякультурнага асяроддзя, інтэрнацыяналізацыю і развіццё экспартнага патэнцыялу БДУ і пабудову яго ўстойлівай эканамічнай мадэлі.

Мы жадаем факультэту дасягнуць усіх пастаўленых мэт і віншуем з юбілеем!

**Ганна Казакова**




*Лекцыйная кніжка Уладзіміра Каракулькі*




*Дыплом ФГН*

УНІВЕРСІТЭТ
29 сакавіка 2024 года, № 3 (2281)

# Жаночаму руху ў БДУ сёлета 25 гадоў

**Дзякуючы ініцыятыве адданых супрацоўніц ВНУ, летам 1999 года была афіцыйна зарэгістравана першая жаночая арганізацыя ў БДУ. Пад нязменным дэвізам «Verbo et facto» (у перакладзе з лацінскай – «Словам і справай») актывісткі ўжо чвэрць стагоддзя прапагандуюць ідэалы сапраўдных каштоўнасцяў, раўнапраўя і справядлівасці, ствараючы спрыяльныя ўмовы для жанчын у навуковым і працоўным асяроддзі ўніверсітэта.**



Спецыфіка жаночай супольнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта праяўляецца ў арыентацыі на навуковую дзейнасць, прыцягненне моладзі да навуковых і патрыятычных ініцыятыў, правядзенне рознага роду канферэнцый, даследчых, асветніцкіх і выхаваўчых мерапрыемстваў. Працэс аб'яднання з Беларускім саюзам жанчын адбываўся паступова, бо стаяла задача і захаваць універсітэцкія традыцыі, і адначасова інтэграваць у рэспубліканскі грамадскі жаночы рух. Такім чынам, ГА «Саюз жанчын БДУ» ў 2023 годзе было перайменавана ў ГА «Камея-клуб» і цалкам увайшло ў склад Беларускага саюза жанчын і пярвічнай арганізацыі БСЖ БДУ.

ПА БСЖ БДУ налічвае каля 500 чалавек. Для эфектыўнага дасягнення пастаўленых мэт арганізацыя была падзелена на клубы. Асноўную частку працы забірае на сябе ўласна «Камея-клуб», які займаецца навуковай і навукова-асветніцкай дзейнасцю. Напрыклад, была створана ўнікальная ў краіне серыя міжнародных навукова-практычных канферэнцый «Роля жанчыны ў развіцці навукі і адукацыі». Першая канферэнцыя прайшла ў 2016 годзе. У ёй удзельнічалі прадстаўнікі з 18 краін, 360 навукоўцаў. Яны абмеркавалі праблемы актуалізацыі ўкладу жанчын у розныя навуковыя галіны, у адукацыйны і выхаваўчы працэс. Пазней праводзіліся такія лакальныя канферэнцыі, як «Жанчыны-навукоўцы Расіі і Беларусі», «Жанчыны-навукоўцы Беларусі і Казахстана», «Жанчыны-навукоўцы Беларусі і Кітая», якія значна паспрыялі развіццю навуковага супрацоўніцтва на міжнародным узроўні.

Таксама важнай акадэмічнай ініцыятывай саюза стала заснаванне і выданне электроннага рэцэнзаванага навукова-асветніцкага часопіса «Сафія», які з 2016 года ўваходзіць у спіс афіцыйных выданняў БДУ і размяшчаецца ў электроннай бібліятэцы ўніверсітэта. Падставай для гонару з'яўляецца і тое, што рэдкалегію часопіса складаюць навукоўцы з сямі краін (Беларусь, Расія, Кітай, Казахстан, Літва, Польшча, Украіна), а само выданне ўваходзіць у бібліяграфічную базу РІНЦ (Расійскі індэкс навуковага цытавання) і ўключаны ў Нацыянальную інфраструктуру ведаў Кітая (CNKI). Рэсурс заслужана стаў міжнароднай платформай для дыялогу навукоўцаў па самых актуальных пытаннях сучаснай навукі, а электронны фармат робіць яго больш даступным для грамадскасці.

З развіццём сістэмы духоўна-маральных і эстэтычных каштоўнасцяў звязаны клуб «Ефрасіння». У ім праводзяцца сустрэчы з пісьменнікамі, дзеячамі мастацтва, арганізоўваюцца майстар-класы і выставы, прысвечаныя традыцыйнай беларускай культуры, мерапрыемствы, прымеркаваныя да важных народных, дзяржаўных і рэлігійных свят. Да Дня жанчын сёлета клуб таксама падрыхтаваў цыкл святочных мерапрыемстваў (інтэрактыўная выстава «Жаночыя штучкі» ў кабінеце-музеі беларускай народнай культуры на філфаку, выстава карцін «Вясна маёй краіны» і інш.), якія падкрэсліваюць важную ролю жаночага пачатку і ў прыродзе, і ў грамадстве.



*– Я хачу пажадаць усім нашым жанчынам і дзяўчатам быць шчаслівымі, мець магчымасць зрабіць многае і для сваёй сям'і, і для краіны. Памятайце, што любая жанчына – гэта дыямент. Любая дзейнасць, якой яна займаецца – вучоба, прафесія, выбудоўванне ўзаемаадносін, выхаванне дзяцей, грамадская праца – паступова адточваюць яе грані. І чым больш жанчына працуе над сабой, рэалізуе ўсе свае функцыі, тым ярчэй яна зіхаціць,* – перадае свае пажаданні старшыня ПА БСЖ БДУ прафесар **Ірына Казакова.**

Не менш актыўным падраздзяленнем арганізацыі з'яўляецца клуб «Алімпія-БДУ», які займаецца прапагандай здаровага ладу жыцця пад галоўным дэвізам: «Здароўе жанчыны – здароўе сям'і, здароўе нацыі». У гэтым кірунку праводзяцца сямейныя, сямейна-спартыўныя фестывалі, тэматычныя лекторыі, мерапрыемствы па ўмацаванні здароўя жанчын. Напрыклад, запамінальнай была сустрэча з урачом вышэйшай катэгорыі, акушэрам-гінеколагам, мамолагам Аляксандрам Паддубным на тэму «Ранняя дыягностыка і прафілактыка раку малочнай залозы», дзе слухачкі маглі задаць пытанні, якія іх хвалююць, атрымаць кансультацыю ў спецыяліста абсалютна бясплатна.

Таксама сумесна «Алімпія» і «Ефрасіння» адказваюць за арганізацыю мерапрыемстваў патрыятычнай, гуманітарна-асветніцкай скіраванасці, правядзенне экскурсій, вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, праект «Мы нашай памяці адданыя!», прымеркаваны да Года гістарычнай памяці (2022), заключаўся ў распрацоўцы пяцідзесяці ўнікальных ваенна-патрыятычных маршрутаў для беларускіх і замежных студэнтаў.

Дарэчы, пра студэнтаў: важным напрамкам працы Саюза жанчын БДУ з'яўляецца сацыяльная работа – клопат пра студэнцкую сям'ю ва ўніверсітэце, патранаж студэнтаў БДУ, якія засталіся без бацькоўскай апекі (праект «Мы дорым вам цяпло нашых сэрцаў!») і рэалізацыя іншых відаў падтрымкі. У арганізацыі актыўна працуе моладзевае крыло, дзе студэнткі розных факультэтаў з першага курса ўдзельнічаюць у мерапрыемствах ПА БСЖ БДУ, у раённых і гарадскіх мерапрыемствах, займаюцца валанцёрствам, напрыклад, дапамагаюць з патранажам дзіцячага дома сямейнага тыпу, замацаванага за ПА. Многія студэнткі потым становяцца супрацоўніцамі і паўнапраўнымі членамі аб'яднання.



**Кацярына Салаўёва**, загадчык навукова-метадычнага аддзела Фундаментальнай бібліятэкі, сакратар ПА БСЖ БДУ:

*– У мяне ёсць дзве выдатныя настаўніцы: Буціна Ала Вячаславаўна, якая доўгія гады працавала намеснікам дырэктара па навукова-метадычнай рабоце Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, і Казакова Ірына Валер'еўна, старшыня ПА БСЖ БДУ. Гледзячы на прыклад актыўнай жаночай пазіцыі, я вырашыла далучыцца да руху. У мяне заўсёды было ўнутранае жаданне дапамагаць іншым, рабіць нешта карыснае для грамадства, і тут знайшлася гэтая магчымасць.*



**Сафія Андрон**, студэнтка 4 курса філалагічнага факультэта, спецыяліст-экскурсавод кабінета-музея беларускай народнай культуры БДУ, прадстаўнік моладзевага крыла ПА БСЖ БДУ:

*– Быць часткай Беларускага саюза жанчын – вялікі гонар, бо тут няма абыякавых людзей. Не раз мне даводзілася арганізоўваць групы для дапамогі анкахворым дзецям, дзіцячым дамам, прыёмным сем'ям, і заўсёды я знаходзіла вялікі водгук сярод сваіх калег-студэнтаў. Калі нашы словы і дзеянні робяць свет для людзей крышачку лепшым, а іх саміх больш шчаслівымі, то, я лічу, гэта ўжо выдатны вынік!*



**Дар'я Стальмашэнка**, студэнтка 5 курса біялагічнага факультэта, прадстаўнік моладзевага крыла ПА БСЖ БДУ:

*– Са школы я любіла ўдзельнічаць у грамадскім жыцці і, калі паступіла ў БДУ, убачыла, колькі розных магчымасцяў дае наш універсітэт. Кожны можа знайсці тую арганізацыю, што яму даспадобы. Я спынілася на ПА БСЖ, таму што гэта выдатны спосаб нагадаць, што жанчыны, аб'ядноўваючыся, могуць змяняць гэты свет да лепшага.*

Існуе таксама клуб актыўных ветэранаў працы і жаночага руху «Спадарыня».

За 25 гадоў дзейнасці жанчынамі зроблена нямала, і характэрна, што ўсе заслугі аказваюцца прызнанымі. Напрыклад, Маскоўская раённая арганізацыя Мінска ГА БСЖ не раз абвяшчала падзяку ПА БСЖ БДУ па выніках гадавой працы за паспяховую праектную дзейнасць, вялікі ўклад у развіццё супрацоўніцтва пярвічных арганізацый і актыўны ўдзел у дабрачыннай дзейнасці. Старшыня арганізацыі Ірына Казакова стала ўладальніцай ганаровага звання «Жанчына года – 2022» у намінацыі «Духоўнасць і культура», а таксама героем рэспубліканскага праекта «Беларуская super жанчына» ў 2023 годзе.

Задачы арганізацыі, якія стаяць наперадзе, застаюцца нязменнымі. Гэта перш за ўсё падтрымка жанчын у грамадскім, эканамічным, сацыяльна-культурным жыцці, а таксама рэалізацыя дзяржаўных праграм па захаванні традыцыйных каштоўнасцяў, выхаванне патрыятызму ў моладзі, спрыянне захаванню ролі сям'і ў грамадстве. Дзверы Беларускага саюза жанчын і ПА БДУ адчыненыя для ўсіх. Гэта выдатная магчымасць рабіць дабро ў коле аднадумцаў. Калі ў вас з'явілася жаданне далучыцца да арганізацыі, то можна напісаць заяву, звярнуўшыся да куратараў ад ПА БСЖ БДУ, якія ёсць у кожным падраздзяленні ўніверсітэта.

**Дар'я Дрозд**

# Свята ў коле «Сяброў» і калег



**Ва ўніверсітэце прайшоў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Дню жанчын. Да святкавання галоўнай сакавіцкай даты далучыліся ўсе падраздзяленні і інстытуты БДУ.**

Напярэдадні свята супрацоўніц і студэнтак універсітэта радавалі акцыямі, флэшмобамі, выставамі і творчымі нумарамі. 6 сакавіка ў рэктараце прайшоў традыцыйны прыём, дзе да Дня жанчын прагучалі віншаванні ад рэктара Андрэя Караля і прарэктарскага корпуса.

Філалагічны факультэт упрыгожыў дзень канцэртнай праграмай і відэазваротам ад студэнцкага актыву.

– Вясна – гэта тая пара, калі мы задумваемся пра самае прыгожае, што знаходзіцца вакол нас. Таму напярэдадні 8 сакавіка ўсе добрыя словы і пажаданні мы адрасуем вам. У гісторыі і літаратуры вам прызнаюцца ў каханні, і гэты працэс не павінен заканчвацца, – адзначылі актывісты.

Быць яркімі і прыгожымі, як вясеннія кветкі, пажадалі жаночай палове падраздзялення ў відэапаведамленні ад прафбюро студэнтаў факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі. Чароўная палова Інстытута бізнесу БДУ далучылася да квесту, падчас якога можна было знайсці святочныя паштоўкі і падарункі. Мужчыны гістфака здзівілі акцыяй «Для вас, любімыя», а кафедра фізічнага выхавання і спорту ўдзельнічала ў «Прыгожым забегу», арганізаваным Беларускай федэрацыяй лёгкай атлетыкі.

Факультэт журналістыкі адзначыў дату песняй «Усё для цябе» ў выкананні дэкана Аляксея Бяляева, выкладчыкаў і студэнтаў. Эканамічны факультэт з дапамогай штучнага інтэлекту паразважаў над пытаннем, якой будзе жанчына-эканаміст у будучыні, а хлопцы юрыдычнага факультэта пачалі святочны дзень з уручэння паштовак дзяўчатам.







Ключавой падзеяй да 8 сакавіка стаў святочны канцэрт «Букет чароўных песень».

З віншаваннямі і цёплымі словамі да жанчын БДУ звярталіся ўдзельнікі ансамбля «Сябры» і яго мастацкі кіраўнік, народны артыст Рэспублікі Беларусь Анатоль Ярмоленка. Для гасцей праграмы прагучалі вядомыя кампазіцыі і новыя песні – «Добрыя людзі», «Алеся», «Гуляць дык гуляць», «Вы шуміце, бярозы» і іншыя.

Супрацоўніца Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Марына Панарад на канцэрт завітала разам з сяброўкай. Удзельніцы святочнай праграмы адзначылі, што найбольш залу ўсхвалявала кампазіцыя на матыў песні Джо Дасэна: калі яна гучала – прысутныя падтрымалі артыстаў ліхтарыкамі на тэлефонах.

– Канцэрт прайшоў пры поўным аншлагу. Анатоль Ярмоленка паміж песнямі жартаваў з публікай, гаварыў віншавальныя словы ў гонар прысутных жанчын. Прыемна, што спявалі і іншыя салісты ансамбля, а гледачы падпявалі добра вядомым з юнацтва песням, – падзялілася ўражаннямі Марына Панарад. – Адна з кампазіцый, якую «Сябры» выканалі ўпачатку, прымусіла задумацца, бо кожны радок адгукаўся ўнутры. У ёй спявалася пра страту простых узаемаадносін між людзьмі ў пагоні за тэхнічным прагрэсам.

**Ірына ІВАШКА**

## НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

Нацыянальны цэнтр маркетынгу Беларусі дамовіўся пра супрацоўніцтва з дзелавымі асацыяцыямі Індыі. У прыватнасці, Нацыянальны цэнтр маркетынгу сумесна з Федэрацыяй гандлёва-прамысловых палат Індыі (FICCI) выступіў арганізатарам сустрэчы міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Алейніка з прадстаўнікамі буйнога індыйскага бізнесу, якая адбылася 12 сакавіка ў Нью-Дэлі.

У Казахстане адкрыюць новую лінію зборкі трактароў BELARUS. Мінскі трактарны завод адкрые цэх кабін і новую лінію зборкі трактароў BELARUS у Кастанаі. Урачыстае мерапрыемства запланавана на 15 красавіка з удзелам высокіх гасцей.

У Беларусі стартавала акцыя па навядзенні парадку на зямлі, добраўпарадкаванні і азеляненні. У населеных пунктах Беларусі пачнуцца пасадкі маладых дрэў і хмызнякоў, будуць закладзены новыя алеі і паркавыя зоны. Тэрміны акцыі сёлета – з 1 сакавіка па 8 мая.

Беларусь і Манголія плануюць развіваць супрацоўніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі. У рамках візіту беларускай дэлегацыі ў Манголію адбылася сустрэча намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Вадзіма Шагойкі з міністрам харчавання, сельскай гаспадаркі і лёгкай прамысловасці Манголіі Хаянгаагійнам Баларчулуунам.

Арганізатары Мінскага паўмарафону чакаюць 20 тыс. удзельнікаў. Мерапрыемства праводзіцца з 2013 года, і кожны новы старт прыцягвае прыхільнікаў здаровага ладу жыцця з ЗША, Швейцарыі, Аўстрыі, Літвы, Латвіі, Казахстана, Турцыі, Расіі і іншых краін. Заяўкі на галоўны забег прымаюцца да 8 жніўня.

Аляксандр Лукашэнка ставіць задачу інтэнсіўнага і эфектыўнага асваення радовішчаў карысных выкапняў. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ўсе карысныя выкапні з'яўляюцца нацыянальным здабыткам краіны, стратэгічным запасам, які належыць народу і толькі народу.

У Беларусі ў гэтым годзе плануюць распрацаваць 415 стандартаў у розных галінах эканомікі. Гэта новыя стандарты ў галіне «разумнага горада», беспілотных транспартных сродкаў, лёгкай, харчовай прамысловасці, забеспячэння адзінства вымярэнняў, сістэм менеджменту і інш.

Беларусь і ААЭ маюць намер развіваць супрацоўніцтва ў сферы сувязі і інфарматызацыі. Пра гэта ішла гаворка падчас перамоў міністра сувязі і інфарматызацыі Канстанціна Шульгана з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у Беларусі Ібрагімам Салімам Махамедам Аль-Мушарахам.

УНІВЕРСІТЭТ
29 сакавіка 2024 года, № 3 (2281)

# У дапамогу медыцыне

**Зусім нядаўна цяжка было сабе ўявіць, што крывацёк спыняецца з дапамогай сурвэтак, а самі яны хутка расшчапляюцца без шкоды для здароўя. Супрацоўнікі Навукова-вытворчага цэнтра фармацэўтычнай дзейнасці ўнітарнага прадпрыемства «Унітэхпрам БДУ» даказалі адваротнае. Цяпер іх распрацоўку – айчынныя гемастатычныя сурвэткі – змогуць выкарыстоўваць як установы аховы здароўя, так і людзі, якія не маюць спецыяльнай медыцынскай адукацыі.**




Як паведаміў галоўны спецыяліст па навуковай і навукова-інавацыйнай дзейнасці «Унітэхпрам БДУ», праца над праектам адбывалася ў кароткія тэрміны, бо прадпрыемства шукала магчымасці для найбольш хуткага выпуску вырабу ва ўстановы аховы здароўя краіны.

Падмуркам распрацоўкі сталі ранней выкананыя супрацоўнікамі заданні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў. Паколькі значная частка работы адбывалася на аснове прэпарата «Цысплацэл» (сурвэткі з акісленай цэлюлозы, якія з'яўляюцца адзіным прэпаратам для лакальнай хіміятэрапіі), на распрацоўку новай тэхналогіі калектыў аддаў паўгода.

– У чалавечым арганізме існуе спецыяльная сістэма для спынення крывацёкаў. Падчас яе функцыянавання ўтвараецца нераствaральны бялок – фібрын. Дзякуючы яму з'яўляецца сетачка, якая агрэгіруе на сябе форменныя элементы крыві. Наш выраб – фактычна заменнік такой сістэмы па-за арганізмам чалавека. Ён першапачаткова ўяўляе сабой сетачку, да якой у працэсе выкарыстання прыляпляюцца элементы крыві, утвараючы тромб («скурку») на паверхні раны, – падзяліўся Павел Бычкоўскі.

Алгарытм дзеяння матэрыялаў вельмі просты. Пры кантакце з крывёй сурвэтка ўбірае яе і набрыньвае, паступова ператвараючыся ў гелепадобнае рэчыва і закупорваючы капіляры. У гэты час актывуецца шматступеньчаты працэс згортвання крыві. А за кошт таго, што акісленая цэлюлоза біялагічна расшчапляецца, сурвэткі цалкам рассмоктваюцца пры правядзенні аперацый. Стваральнікі кажуць, што выраб з лёгкасцю можна выкарыстоўваць і пры бытавых траўмах – для гэтага трэба толькі пакласці сурвэтку на рану і зрабіць фіксацыйную павязку. А ўтылізаваць матэрыялы можна будзе разам з бытавым смеццем.

Зараз распрацоўка ўжо прайшла даклінічныя выпрабаванні і знаходзіцца на этапе рэгістрацыі. Плануецца, што вытворчасць гемастатычных сурвэтак запусцяць сёлета, пасля чаго яны з'явяцца ў клініках і аптэках краіны. Дарэчы, выпускаць выраб медыцынская прызначэння будуць на вытворчым участку «Унітэхпрам БДУ» на беларускім абсталяванні з прымяненнем айчыннай сыравіны.

У чым жа перавага беларускіх гемастатычных сурвэтак у параўнанні з замежнымі аналагамі? Па словах галоўнага спецыяліста па навуковай і навукова-інавацыйнай дзейнасці, айчынны прэпарат будзе значна таннейшы (яго кошт будзе меншым прыкладна на 40%, што зробіць яго больш даступным). У іншым розніцы няма. Разам з тым Павел Бычкоўкі адзначыў, што распрацоўка будзе запатрабаванай не толькі ў Беларусі, але і на тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза – на гэтым рынку таксама адчуваецца недахоп гемастатычных матэрыялаў. Запыты на падобныя матэрыялы неаднойчы прыходзілі падчас міжнародных выстаў, таму навуковыя сувязі наладжваюцца не толькі з дзяржавамі-суседкамі, але і з краінамі Афрыкі.

# «Разумныя» дабаўкі з БДУ




**Даследчыкі навукова-вытворчага цэнтра харчовых тэхналогій УП «Унітэхпрам» БДУ распрацавалі дзве новыя харчовыя дабаўкі – сумесь для выпечкі хлеба «Вера» і фітакомплекс «Маяк». Пра навінкі і вытворчы працэс пагутарылі з начальнікам падраздзялення Таццянай МАДЗІЕЎСКАЙ.**

Па яе словах, абедзве распрацоўкі ўвайшлі ў серыю «Ежа разумнага горада», якая ўлічвае асаблівасці жыццёвага ўкладу сучаснага чалавека і забяспечвае арганізм важнымі элементамі. Усе прадукты серыі забяспечваюць патрэбы пэўнай катэгорыі спажыўцоў – людзей з высокімі псіхаэмацыйнымі нагрузкамі, паніжанай фізічнай актыўнасцю, тых, каму патрэбна ўмацоўваць імунітэт. Галоўныя крытэрыі такіх дабавак – карысць і даступнасць.

Распрацоўка «Вера» ўяўляе сабой сухую парашкападобную сумесь, з якой робяць жытне-пшанічны хлеб. Адметнасць дабаўкі ў тым, што цяпер бохан можна выпекчы ў адну стадыю, проста дадаўшы ў парашок вады. Доўгія тэрміны падрыхтоўкі цеста цяпер застаюцца ў мінулым. Пры гэтым прадукт утрымлівае шмат харчовых валокнаў і багаты на цынк, магній, вітаміны групы B. Такі склад добра ўплывае на нервовую і імунную сістэму, стан кішэчніка, зніжае ўзровень цукру ў крыві, а таксама не дазваляе пераядаць.

– Паказваць, што наш хлеб смачны і вельмі якасны – добры і правільны напрамак. Вырабіць чорны хлеб няпроста, паколькі звычайна працэс адбываецца ў некалькі стадый, гэтым займаюцца спецыялісты высокага ўзроўню. На базе ведаў, якім павінен быць сапраўдны беларускі хлеб, мы імкнёмся зрабіць так, каб ён палюбіўся і самім беларусам, і прадстаўнікам іншых народаў, – заўважыла Таццяна Мадзіеўская. – Напрыклад, нядаўна мы дасылалі ў Японію ўзоры гатовых вырабаў. Яны былі высока ацэненыя мясцовымі спецыялістамі, нягледзячы на тое, што іх культура харчавання адрозніваецца. Туды ж ужо адпраўлена першая стакілаграмовая партыя кампазітнай сумесі.

Дарэчы, у гэтай дабаўкі ёсць свая рэклама. Афармiць яе спецыялістам цэнтра харчовых тэхналогій дапамагла студэнтка факультэта сацыякультурных камунікацый Арына Хацкевіч. Такім чынам, як кажа Таццяна Мадзіеўская, аб'ядноўваецца вопыт практыкаў з крэатывам навучэнцаў БДУ. Мала хто ведае, але і назву вырабу прыдумалі невыпадкова: яму далі імя Веры Надтачэевай – адной з распрацоўшчыц, што займалася выпечкай прадукцыі з сумесі.

Над узбагачальным фітакомплексам «Маяк» працавалі фізіка-хімікі, біяхімікі і тэхнолагі навукова-вытворчага цэнтра харчовых тэхналогій. Кампазіцыю стварылі на аснове раслінных кампанентаў – пажытніку, белага перцу, каляндры – яны валодаюць антыаксідантнай актыўнасцю і насычаны магніем.

– Магній важны для тармажэння ўзбуджэнняў у цэнтральнай нервовай сістэме. ЦНС чула рэагуе на ўзровень гэтага элемента ў арганізме, паколькі яго недахоп можа выклікаць неспакой, страх, бяссонніцу, стомленасць, а таксама зніжэнне ўвагі, – патлумачыла начальнік навукова-вытворчага цэнтра харчовых тэхналогій.

Па словах распрацоўшчыкаў, дабаўка з'яўляецца функцыянальным інгрэдыентам для стварэння прадукцыі антыстрэсарнай скіраванасці, таму што яна зніжае канцэнтрацыю гармонаў стрэсу ў арганізме і павышае ў мозгу колькасць абаронча метабалітаў, трыптафану і сератаніну. Якасныя характарыстыкі «Маяка» ўжо паспелі прывабіць буйныя хлебныя вытворцы: у філіяле «Берасцейскі пекар» Пінскага хлебазавода запусцілі хлеб «Карысны выбар», а пяты і трэці хлебазаводы «Мінскхлебпрама» дадаюць комплекс у новыя лінейкі прадукцыі. Акрамя таго, за дабаўку калектыў даследчыкаў атрымаў дыплом I ступені і залаты медаль на конкурсе «Найлепшы інавацыйны праект і найлепшая навукова-тэхнічная распрацоўка года» ў Санкт-Пецярбургу.

Ірына ІВАШКА



# Нестэрэатыпны бібліятэкар

**«Памераць» навуку, вырашыць тэхнічныя непаладкі розная цяжкасці і развеяць міфы пра прафесію можа супрацоўнік Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Ягор СКОРЫЙ, з якім карэспандэнт газеты заступае на «змену» ў сакавіку.**



Наш працоўны дзень пачынаецца з прагляду электроннай пошты. Туды звычайна прыходзяць дакументы для платных паслуг ці вучэбныя праграмы, літаратуру з якіх выкладчыкі ўзгадняюць з супрацоўнікамі бібліятэкі. Першая змена доўжыцца з паловы дзявятай да 17 гадзін, другая пачынаецца а палове дзясятай і заканчваецца а дзевятнаццатай.

«Напарнік» кажа, што звычайна падчас сесіі ці здачы курсавых работ колькасць наведвальнікаў за адзін дзень узрастае амаль да ста чалавек. А самы «штыль» сярод чытачоў прыпадае на сакавік-красавік. Таксама Ягор пералічвае свае абавязкі:

– Вось, напрыклад, даследчыкі пішуць навуковыя артыкулы. Часта ў патрабаваннях да канферэнцый прапісваецца неабходнасць указаць індэкс універсальнай дзесятковай класіфікацыі (УДК). Калі чалавек не можа зрабіць гэта сам, звяртаецца да нас. Бліжэй да сесіі становіцца запатрабаваным спіс літаратуры па нейкай тэме, афармленне спіса літаратуры ў адпаведнасці з патрабаваннямі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ці дапамога ў пошуку артыкулаў па тэме курсавой ці дыпломнай работы, – уводзіць у курс справы спецыяліст. – Таксама на першым курсе мы выкладаем дысцыпліну «Універсітэтазнаўства». Калі з асноўным пластом працы скончана, бібліятэкары займаюцца інвентарызацыяй кніг – звяраюць наяўнасць выданняў з электронным каталогам.

## Кожная сітуацыя – як шашачная партыя

Сёння Ягору трэба ўсталяваць манітор у кабінеце калег, а таксама падключыць счытвальнік штрыхкодаў у зале перыёдыкі. Правяраючы тэхніку і размяркоўваючы правады ў патрэбныя гнёзды, ён адказвае на пытанні. Аказваецца, у юнацтве хлопец захапляўся шашкамі і мае другі юнацкі разрад. Гэтым заняткам яго зацікавілі прадстаўнікі мясцовай спартыўнай школы, што прыйшлі на сустрэчу з вучнямі. Паколькі бавіць час «на вуліцы» падлетак не хацеў, ён пераключыў сваю ўвагу на шашкі. Таксама займаўся вольнай барацьбой. Гэтыя віды спорту, як аказалася, пасля паўплывалі на вобраз мыслення хлопца.

– Калі ты малы, проста цікава ездзіць на мерапрыемствы і знаёміцца з новымі камбінацыямі і людзьмі. А зараз гэта вылілася ў тое, што часта ў працы думаю над нейкай сітуацыяй, быццам над партыяй ці паядынкам. У такія моманты разумею, як сам павінен сябе паводзіць, а як можа адрэагаваць суразмоўца, – кажа Ягор.

Так склалася, што малады бібліятэкар вучыўся пастаянна: спачатку ў школе і мінскім гарадскім ліцэі, затым ва УВА. Хлопец паступіў на мехмат БДУ, але пасля двух гадоў вучобы ён зразумеў, што далей не бачыць сябе праграмістам, і забраў дакументы. Ягор Скорый хацеў звязаць свае тэхнічныя навыкі з гуманітарнымі навукамі. Гэтаму ў нейкай ступені паспрыяў прыклад Васіля Нешытога, які выкладаў на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ. Таму для вучобы выбіраў сярод гістарычнага і філалагічнага факультэтаў, ФФСН, а таксама – Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, на якім і спыніўся.

– Раней я смяяўся, што стаў бібліятэкарам, бо ўбачыў кіно пра кніжкі і быў зачараваны. Аднак нічога такога не было. Я шмат думаў, абмяркоўваў з сябрамі і выкладчыкамі. А паколькі вучыцца было цікава, знайшоў тое, чым хацеў займацца, падаў дакументы ў магістратуру. У першы год працы моцна не хапала паглыблення ў даследаванні, абмеркавання нейкіх з'яў з навуковага боку. Калі зразумеў гэта, пытання «ісці – не ісці» ў магістратуру не ўзнікала, – дзеліцца бібліятэкар.

## Спецыяліст на стыку дысцыплін

Мара хлопца стаць спецыялістам на стыку дысцыплін стала рэальнай якраз у БДУКМ, бо тут ён адкрыў для сябе навукаметрыю – дысцыпліну, «што ведае, як памераць навуку». Тут жа Ягор тлумачыць:

– Як вырашыць, каму з двух навукоўцаў даць грант? У гэтым дапамагае індэкс Хірша. Уявім, што ў аднаго з іх 10 артыкулаў і 10 спасылак на іх, у другога – 9 артыкулаў і 9 выпадкаў цытавання. Зразумела, што добрыя вынікі ў абодвух, але грант атрымае першы. Для вызначэння індэкса Хірша ў базах даных РІНЦ і Google Scholar звяртаюцца выкладчыкі. Акрамя таго, у БДУ ёсць персанальныя старонкі навукоўцаў з інфармацыяй пра іх публікацыйную дзейнасць (гэта карысна самім даследчыкам, а таксама добра ўплывае на імідж універсітэта).

У перапынках паміж працоўнымі задачамі бібліятэкар падзяліўся цікавым назіраннем: мужчыну-бібліятэкара ў калектыве звычайна ці ведаюць усе, ці не ведае ніхто. Залатая сярэдзіна тут хутчэй рэдкае выключэнне. Дарэчы, абапіраючыся на тэорыю, Ягора самога можна аднесці да супрацоўнікаў першай катэгорыі. Наш працоўны дзень праходзіць напярэдадні пераводу спецыяліста на пасаду загадчыка аддзела інфармацыйнага суправаджэння публікацыйнай дзейнасці, што знаходзіцца ў іншым корпусе БДУ, таму нельга не звярнуць увагу на рэпліку жанчын-калег, якія, бачачы хлопца ў гэты час, кажуць:

– Ягор, а можа, застанешся? І як мы тут без цябе?

Дарэчы, супрацоўнікі медыятэкі імя М. Я. Цікоцкага апісваюць Ягора Скорыя як безадмоўнага, надзейнага калегу з добрым пачуццём гумару.

– З ім вельмі камфортна працаваць. Калі патрэбная дапамога з тэхнікай, ён імгненна ўсё вырашыць. У нас з ім шмат агульнага, і гэта выдатна. Калі з Ягорам пакамунікаваць працяглы час, становіцца бачна, што ён добры, разумны і разбіраецца ў многіх сферах. З яго стаўленнем да працы ён дасягне многага ў бібліятэчнай справе, – заўважае бібліятэкар Юлія Клямята.

Ідучы на сустрэчу да Ягора, моцна хацела запытаць у яго, што ён думае наконт стэрэатыпа, што бібліятэкар – жаночая прафесія. Хлопец, разважаючы пра гэта, толькі ўсміхаецца і кажа, што такое ўяўленне навеяна сучаснасцю, паколькі вядомыя імёны ў бібліятэчнай справе постсавецкай прасторы належаць менавіта мужчынам (Вадзім Сцяпанаў, Аркадзь Сакалоў, Мікалай Рубакін і інш.). Спецыяліст перакананы, што ў прафесійным асяроддзі існуе адваротны стэрэатып: маўляў, мужчыну прасоўвацца па кар'ернай лесвіцы ў гэтай прафесіі лягчэй. Таксама распаўсюджаная сітуацыя, калі пры першым знаёмстве людзі даведваюцца, што перад імі бібліятэкар, і адразу ж запытваюцца, якую кнігу той раіць прачытаць. Але пры гэтым мала хто думае, што такі спецыяліст не заўсёды працуе з кнігамі (займаецца часопісамі, суправаджае навуковую дзейнасць і інш.).

## «Кніжны» гумар, ці «Падручнік быў зялёным»

Высвятляецца, што ў супрацоўнікаў бібліятэкі ёсць шмат цікавых сітуацый, якія адбываліся на іх практыцы. Ягор заўважае, што сам ужо блытае жарты пра бібліятэкараў з інтэрнэту і смешныя моманты з яго прафесійнага жыцця, бо ўсе тыя жарты маглі адбывацца ў рэальнасці. Самі супрацоўнікі медыятэкі нават сабралі калекцыю смешных сітуацый і фраз накшталт «Не памятаю аўтара, падручнік быў зялёны» і «Гэта чытальная зала? А дзе проста бібліятэка?» Нярэдкія ў іх працы і такія дыялогі:

– Мне патрэбная кніга, Анненкава-Рудэнка, якую парэкамендавала выкладчык.

– Рудэнка – «Современный русский язык», а Анненкавай якую кнігу даваць?

– А хіба гэта не адзін аўтар з двайным прозвішчам?

Напрыканцы дня ўсё ж нельга не пацікавіцца ў Ягора пра яго любімыя кнігі. Першай бібліятэкар называе булгакаўскага «Майстра і Маргарыту» – яшчэ ў ліцэйскія гады пры знаёмстве з выданнем не мог заснуць усю ноч, разважаючы над агульнымі пытаннямі рамана. На другім месцы – «Вёска» Андрэя Федарэнкі. Хлопец лічыць, што, каб зразумець характар беларуса, трэба ўважліва прачытаць менавіта гэты твор.

Задумваючыся над тым, ці зменіць бібліятэкараў штучны інтэлект, хлопец кажа, што ўсё залежыць ад бачання бібліятэкі будучыні. Для некага чытальная зала без бібліятэкараў – дзівацтва, а для некага – цікавы і апраўданы ход. Аднак у любым выпадку прафесія цалкам не знікне, паколькі бібліятэкары – шматгранныя спецыялісты, якія змогуць знайсці сябе ў любой творчай прасторы.

– Таксама ў вас могуць быць розныя адносіны як да папяровых, так і да электронных кніг. Такім спрэчкам не бачна канца, але я думаю – выбіраць трэба тое, што зручна. Бо не важна, які ў кнігі фармат, важна, каб людзі чыталі, – рэзюмуе Ягор Скорый.

**Ірына ІВАШКА**

УНІВЕРСІТЭТ
29 сакавіка 2024 года, № 3 (2281)

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс
## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [2] На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, вучоную ступень доктара або кандыдата навук, навуковыя працы, стаж работы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [3] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, ці навуковае званне прафесара, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| | [4] На пасаду дацэнта прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, вучоную ступень доктара або кандыдата навук, навуковыя працы або вынаходствы, патэнты, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 1 год. |
| | [5] Вышэйшая адукацыя, якая адпавядае педагагічнай дзейнасці, ці вышэйшая адукацыя, што адпавядае навучальнаму прадмету (навучальнай дысцыпліне), і перападрыхтоўка па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» без прад’яўлення патрабаванняў да стажу працы |
| **Старшы выкладчык** | На пасаду старшага выкладчыка прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 3 гады. |
| | [6] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |

**Эканамічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры лічбавай эканомікі | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры лічбавай эканомікі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці | 5 гадоў |
| Выкладчык кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі | |
| Старшы выкладчык кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 27 мая.

**Інстытут бізнесу БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры інавацыйнага кіравання | 5 гадоў |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 213; да 27 мая.

**Гістарычны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў | 1 год |
| Прафесар кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў | 1 год |
| Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу | 1 год |
| Дацэнт кафедры крыніцазнаўства | 1 год |
| Дацэнт кафедры крыніцазнаўства | 5 гадоў |
| Выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: Гістарычны факультэт, вул. Мендзялеева, 36, аўд. 103; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: Гістарычны факультэт, вул. Мендзялеева, 36, аўд. 103; да 27 мая.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі | 1 год |
| Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі | 4 гады |
| Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыялогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры філасофіі культуры | 1 год |
| Дацэнт кафедры філасофіі культуры | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай працы і рэабіліталогіі | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | |
| Выкладчык кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, к. 528; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, к. 528; да 27 мая.

**Хімічны факультэт БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры неарганічнай хіміі | 1 год |
| Загадчык кафедры фізічнай хіміі | 1 год |
| Загадчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі | 1 год |
| Прафесар кафедры арганічнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры арганічнай хіміі | |
| Старшы выкладчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі | |
| Старшы выкладчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | |
| Старшы выкладчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | |
| Старшы выкладчык кафедры фізічнай хіміі | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 27 мая.

**Механіка-матэматычны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры матэматычнай кібернетыкі | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | 1 год |
| Прафесар кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 3 гады |
| Прафесар кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 1 год |
| Прафесар кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 1 год |
| Прафесар кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры тэорыі функцый | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры тэорыі функцый | 1 год |
| Дацэнт кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі | 4 гады |
| Дацэнт кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп’ютарнага мадэлявання | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі | |
| Старшы выкладчык кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі | |
| Старшы выкладчык кафедры бія- і нанамеханікі | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: пр. Незалежнасці 4, к. 207; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: пр. Незалежнасці 4, к. 207; да 27 мая.

**Факультэт міжнародных адносін аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду |
|---|---|
| Загадчык кафедры комплекснага вывучэння развіцця КНР | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры рамана-германскіх моў міжнароднай прафесійнай дзейнасці | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 504; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 516; да 27 мая.

**Фізічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 27 мая.

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА**
**АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД**

1. Вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі эліёнікі па спецыяльнасці 01.04.07 «Фізіка кандэнсаванага стану» – 1 чалавек;
2. Старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі эліёнікі па спецыяльнасці 01.04.03 «Радыёфізіка» – 1 чалавек.

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230, да 27 красавіка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230, да 27 мая.

## УЗНАГАРОДЫ

Нагрудны знак Міністэрства адукацыі Беларусі «Выдатнік адукацыі» ўручаны начальніку ўпраўлення міжнародных сувязяў **Аляксандру Жуку.**

За добрасумленную плённую працу ў сістэме адукацыі, творчую ініцыятыву, высокія дасягненні ў прафесійнай дзейнасці Граматай Міністэрства адукацыі Беларусі ўзнагароджана начальнік прэс-службы **Алена Марцулевіч.**

Падзякі рэктара БДУ за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў ганараваны дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя **Анатоль Тозік.**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 29.03.2024 г.
Зак. 327. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Карэктар** Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***